# СТАВІМ ОПЕРУ

## Праграма пастаноўкі дзіцячай оперы "Вавёрчына гора" па аднайменнай казцы В. Віткі

*(Заканчэнне. Пачатак у № 10)*

### АДКУЛЬ УЗНІКАЮЦЬ КАЗКІ (1 г)

**Разглядванне малюнкаў**, якія дзеці зрабілі дома.

**Праслухоўванне заканчэнняў казкі**, якія прыдумалі дзеці, і іх абмеркаванне.

**Праслухоўванне ўрыўкаў з песень**, напісаных да казкі Э. Успенскага "Чабурашка" (муз. У. Шаінскага, сл. А. Цімафееўскага), і наступная гутарка: да якой казкі напісаны песні? Назавіце галоўных герояў казкі. Ці падабаюцца вам песні? Чым? Якім чынам песні дапамагаюць нам даведацца аб характары героя? Якімі словамі можна ахарактарызаваць песню Чабурашкі (кракадзіла Гены і г. д.)? (Спіс слоў, якія характарызуюць эмацыянальна-вобразны змест музыкі, можна знайсці ў кнізе В. П. Радынавай "Слухаем музыку". — М., 1990. С. 12.) Якімі словамі вы можаце ахарактарызаваць гэтыя песні?

**Харавое выкананне песні** з казкі "Чабурашка" Э. Успенскага, якая суправаджаецца свабоднымі рухамі.

**Праслухоўванне маналога Э. Успенскага "Адкуль узнікаюць казкі?"** з наступным абмеркаваннем адказаў на пытанне: якія якасці характару дапамагаюць Э. Успенскаму пісаць казкі? (Перш за ўсё — назіральнасць.)

**Гульня "Здагадайся адкуль".**

Хтосьці з гурткоўцаў спявае куплет песні з мультфільма (казкі, дзіцячай оперы і г. д.). Дзеці называюць твор, яго аўтара.

**Гутарка аб прафесіі кампазітара**: хто стварае музыку? Для каго яна пішацца? Назавіце прозвішчы кампазітараў, якія вам вядомы.

**Прыдумванне дзецьмі мелодый.** Педагог прапануе вучням уявіць сябе кампазітарамі і паспрабаваць сачыніць музыку да ўрыўкаў з казкі В. Віткі. Групам дзяцей прапануюцца словы Вавёркі, Сына Вавёркі, Дочак Вавёркі і г. д.

**Праслухоўванне і аналіз** дзіцячых музычных сачыненняў.

**Выкананне лепшых музычных версій** усімі ўдзельнікамі гуртка.

**Развучванне аўтарскага варыянта.**

**Дамашняе заданне:** перачытаць казку. Жадаючыя могуць прыдумаць мелодыю да пэўнага ўрыўка з 1-й часткі.

### САЧЫНЕННЕ МЕЛОДЫЙ НА ВЕРШАВАНЫЯ ТЭКСТЫ З КАЗКІ В. ВІТКІ "ВАВЁРЧЫНА ГОРА" (3 г)

*1-я гадзіна.*

**Праслухоўванне і аналіз** прыдуманых дзецьмі дома мелодый.

**Разгадванне загадак** пра бусла, дзятла і крата з кнігі М. Пазнякова "Тры чарадзеі" (с. 71, 73) з наступнай гутаркай: якія словы з загадкі дапамаглі вам здагадацца, пра каго ідзе размова? Што вы ведаеце пра бусла (дзятла, крата)? Якой павінна быць музыка, што раскажа пра бусла (дзятла, крата)? Які з дзіцячых музычных інструментаў найбольш падышоў бы для яе выканання? У якіх вядомых вам казках сустракаюцца бусел, дзяцел, крот? Назавіце творы, дзе героямі з'яўляюцца гэтыя персанажы.

**Чытанне маналога** Бусла (Дзятла, Крата) рознымі выканаўцамі са зменай інтанацыі і з наступнымі адказамі на пытанні: які характар мае ваш герой? Якія б фарбы вы выбралі, каб намаляваць яго?

**Гульня "Здагадайся хто".** Педагог ці адзін з вучняў апісвае кагосьці з персанажаў, а дзеці адгадваюць, пра каго ідзе размова. Потым кіраўнік гуртка або спецыяльна падрыхтаваны вучань спявае кароткую мелодыю без слоў, якую прыдумаў сам і якая, на яго думку, перадае характар персанажа, а дзеці адгадваюць, пра каго спявае аўтар мелодыі. Вызначаецца, што для Крата характэрны мелодыі ў больш нізкім рэгістры, для Дзятла — у стылі марша, для Бусла — у выглядзе плаўнай песні, якая нагадвае яго палёт.

**Сачыненне мелодый** на вершаваныя тэксты з казкі Васіля Віткі (кожнай групе даецца асобны ўрывак). Дзеці пры сачыненні мелодыі могуць выходзіць за пэўныя рамкі: незавершаныя інтанацыі, парушэнне ладавых суадносін і г. д. Педагог павінен падтрымаць творчасць вучняў і абавязкова пахваліць кожнага аўтара, далікатна выправіўшы памылкі.

**Праслухоўванне атрыманых музычных версій.**

**Развучванне аўтарскага варыянта.** Параўнанне яго з дзіцячай творчасцю.

**Дамашняе заданне:** чытанне наступнай часткі і афармленне дзвюх старонак кніжкі. На адной старонцы — урывак з казкі (1 — 2 выпісаныя чатырохрадкоўі, якія найбольш спадабаліся), на другой — малюнак.

*2-я гадзіна.*

**Гутарка** аб тым, чым закончылася гісторыя Вавёркі з казкі В. Віткі.

**Узнаўленне лепшых канцовак казкі,** што прыдумалі дзеці.

**Параўнальны аналіз** вобразаў Вавёркі і іншых герояў у пачатку і ў канцы казкі. Гутарка па пытаннях: якімі б фарбамі вы карысталіся, каб перадаць настрой Вавёркі ў пачатку казкі? У канцы? Якія па характару былі мелодыі, што мы сачынялі, на словы Вавёркі? Які характар мелодый будзе ў нашых сачыненнях зараз?

**Харавое выкананне** песенькі, якая больш спадабалася і запомнілася з папярэдніх заняткаў.

**Сачыненне мелодый** на маналогі Вавёркі і яе Дочак.

**Праслухоўванне і аналіз** музычных сачыненняў. Развучванне аўтарскага варыянта.

**Дамашняе заданне:** чытанне наступнай часткі казкі і афармленне яшчэ дзвюх старонак кніжкі.

*3-я гадзіна.*

**Выкананне лепшай версіі** з прыдуманых дзецьмі на мінулых занятках мелодый у розных рэгістрах. Гутарка па пытаннях: хто з жывёл мог бы так праспяваць (пасля выканання музыкі ў нізкім рэгістры)? А як праспяваў бы гэту мелодыю, напрыклад, Буслік? Калі б ноткі яшчэ скокнулі ўгору, якая б мелодыя атрымалася? Як спяваў бы гэту мелодыю герой, які спяшаецца? Які толькі што прачнуўся? А ці можна праспяваць такую песеньку на адным дыханні?

**Узгадванне правіл правільнага дыхання.** Педагог невыразна спявае песеньку і просіць адказаць на пытанні: ці спадабалася вам, як я праспявала? Чаму? Ці зразумеў бы, напрыклад, Дзяцел Вавёрчыных Дочак, калі б яны так спявалі? Што б магло здарыцца, каб Дзяцел не зразумеў Дочак Вавёркі? (Варта выслухаць як мага болей розных версій.) Як трэба спяваць дадзеную мелодыю?

**Спяванне ўрыўка.**

**Гутарка пра Вавёрку** — галоўнага героя казкі. Пра каго кажуць — невялічкая, рыжаватая, з доўгім хвастом, любіць арэшкі? Якія казкі з удзелам вавёркі вы ведаеце? Якой вы ўяўляеце сабе Вавёрку з казкі Васіля Віткі? Якімі б фарбамі вы яе намалявалі? Што б намалявалі побач з ёй?

**Гульня "Праспявай імя героя казкі".** Педагог пляскае ў далоні некалькі разоў. Колькасць воплескаў супадае з колькасцю складоў у імёнах герояў. Дзеці спяваюць (на любы матыў) вядомыя ім імёны.

**Сачыненне мелодый** на выбраную частку тэксту з казкі.

**Выкананне і аналіз** атрыманых мелодый. Развучванне аўтарскага варыянта.

**Дамашняе заданне:** афармленне наступных старонак кніжкі.

### ПАДРЫХТОЎКА ДЭКАРАЦЫЙ (1 г)

**Расказ** педагога аб працы мастакоў у тэатры: мастака-пастаноўшчыка, мастака-дэкаратара, мастака па касцюмах, мастака па грыму. Віды дэкарацый і асаблівасці іх выкарыстання.

**Адгадванне загадак** пра дрэвы і кветкі. (Загадкі можна знайсці ў кнігах М. Пазнякова "Тры чарадзеі" (Мн.: "Юнацтва", 1991. С. 71 — 84), У. Мацвіенкі "Загадкі Зайкі-загадайкі" (Мн., "Юнацтва", 1990).

**Разглядванне і аналіз** рэпрадукцый з карцін з адлюстраваннем лесу і кветак: З. Аляксандрава "Букет", В. Жолтак "Званочкі лясныя", С. Катковай "Сакавік", М. Сар'яна "Кветкі", В. Сярова "Адчыненае акно. Бэз", І. Хруцкага "Партрэт жонкі з кветкамі і фруктамі". Гутарка па пытаннях: якія фарбы пераважаюць у гэтых карцінах? Якую ролю адыгрывае колер? Як ён звязаны з настроем карцін?

**Разглядванне ілюстрацый** да казак з выявамі кветак і дрэў.

**Прыдумванне эскізаў** дэкарацый да дзей оперы. Кожная група прыдумвае сваю частку дэкарацый.

**Маляванне** элементаў дэкарацый.

## ПАДРЫХТОЎКА КАСЦЮМАЎ (1 г)

**Разгадванне загадак** пра звяроў.

**Гутарка** аб прафесіі мастака па касцюмах па пытаннях: у чым заключаецца праца мастака па касцюмах? Ці змяняецца наша ўспрыняцце героя ў залежнасці ад яго вопраткі? Як? У які касцюм вы апранулі б, напрыклад, Снежную Каралеву? Чаму? А каго з герояў вядомых вам казак вы апранулі б, напрыклад, у чырвоны касцюм? У касцюм блакітнага колеру? Як павінны, на вашу думку, выглядаць касцюмы герояў з казкі Васіля Віткі? Якімі элементамі ўпрыгожылі б гэтыя касцюмы вы?

**Гульня "Клоун".** Лялька (можна зрабіць з паперы) "пераапранаецца" ў розныя касцюмы. Пасля кожнага "пераапранання" праводзіцца аналіз: як мяняецца ўспрыняцце клоуна ў залежнасці ад касцюма?

**Маляванне эскізаў касцюмаў.** Дзецям прапануецца ўявіць сябе мастакамі па касцюмах і "апрануць" свайго героя.

**Выраб элементаў да касцюмаў:** Буслу — крылы і дзюбу, Вавёрцы — вушкі, Дзятлу — дзюбу і да т. п.

## ІМПРАВІЗАЦЫЯ МУЗЫЧНА-РЫТМІЧНЫХ РУХАЎ ІМІТАЦЫЙНАГА ХАРАКТАРУ

**Выразнае чытанне** маналога першага героя.

Гутарка па зместу маналога. Змест пытанняў залежыць ад нумара дзеі оперы, над якой працуе педагог на дадзеным этапе.

**Сачыненне музыкі** да маналога, рухаў. Каб знайсці выразныя рухі, якія суадносяцца са словамі і музыкай, вучні спачатку выконваюць атрыманую харавую партыю, выяўляюць яе характар, сродкі музычнай выразнасці. Пасля плануюць варыянты пэўных рухаў. Лепшыя рухі спачатку паўтараюцца павольна з узору, потым хутчэй і самастойна. Дзеці вучацца праз рухі, музыку выяўляць моцныя і слабыя долі, перадаваць дынаміку асобных сказаў, пытальную, апавядальную і клічную інтанацыі.

**Гульня "Здагадайся, які інструмент іграе".** Кіраўнік гуртка прапануе ўрыўкі з вядомых дзецям твораў розных жанраў у выкананні розных музычных інструментаў. Вучні імітуюць ігру на тым інструменце, які гучыць. Педагог сочыць за тым, каб рухі выконваліся адпаведна дынаміцы твора. "Свабодным дырыжыраваннем" дзеці могуць перадаваць характар музыкі. На прыкладзе п'есы Г. Вагнера "Труба і барабан" вучні робяць вывад, што на фартэпіяна можна імітаваць гучанне розных інструментаў. Гутарка па пытаннях: да якога жанру адносіцца музыка, што гучала? Як называецца твор? Хто кампазітар? З чым можна параўнаць гэтую музыку? Якую б карціну намалявалі да яе вы?

**Імправізацыя музычна-рытмічных рухаў** да пэўных урыўкаў з казкі. Развучванне лепшых варыянтаў. Інсцэніроўка.

**Гульня "Намалюй інструмент для кожнага героя казкі".** Дзеці малююць героя казкі, які іграе на пэўным інструменце.

**Дамашняе заданне:** заканчэнне працы над малюнкам.

## ПАСТАНОЎКА ЧАСТКІ ОПЕРЫ

Кіраўнік гуртка нагадвае, што опера — гэта музычны спектакль, дзе ўсе дзеючыя асобы свае пачуцці і думкі выражаюць праз спевы; расказвае пра першую беларускую оперу для дзяцей, якую напісалі кампазітар Р. Пукст і паэтэса Э. Агняцвет.

**Гутарка пра вядомыя дзецям оперы:** пра каго ідзе гаворка ў оперы "Воўк і сямёра казлянят"? Пералічыце імёны казлянят з казкі. Назавіце герояў, што сустракаюцца ў оперы, але адсутнічаюць у аднайменнай казцы.

Праслухоўванне ўрыўка з дзіцячай оперы "Воўк і сямёра казлянят" (сл. Е. Манучаравай, муз. І. Каваля).

**Гутарка пра характары герояў оперы**: як песні герояў дапамагаюць нам зразумець іх характар? Як трэба выконваць песню Мамы-казы? Як вы ўяўляеце сабе Маму-казу? Усязнайку? Бадайку?.. Параўнайце песню Мамы-казы з хорам "Цэлы дзень спяваем, іграем".

**Гульня "Хто я?".** Вядучы з дапамогай мімікі і пантамімы паказвае аднаго з герояў оперы І. Каваля, потым з казкі Васіля Віткі. Дзеці адгадваюць, каго паказвае вядучы, і расказваюць, што дапамагло ім знайсці правільны адказ.

**Выбар "акцёраў".** Ствараецца некалькі саставаў выканаўцаў для гэтай часткі оперы.

**Узгадванне вывучаных музычных партый.**

**Развучванне новых музычных партый.**

Пастаноўка ўсёй часткі.

**Дамашняе заданне:** паўтарыць сваю партыю.

## ПАСТАНОЎКА ОПЕРЫ (2 г)

Паўтарэнне (пры неабходнасці) некаторых урыўкаў оперы.

**Пастаноўка** оперы ад пачатку да канца.

**Абмеркаванне** пастаноўкі оперы.

**Разглядванне** афармленых дзецьмі кніжак.

**Узнагароджванне ўдзельнікаў пастаноўкі** па наступных намінацыях:

лепшае артыстычнае выкананне;
лепшае вакальнае выкананне;
лепшае харэаграфічнае выкананне;
самая доўгая роля;
самая кароткая роля;
лепшы мастак дэкарацый;
лепшы мастак па касцюмах;
лепшы кампазітар.

Кіраўнік гуртка можа павялічыць колькасць намінацый для таго, каб узнагароды атрымалі ўсе ўдзельнікі пастаноўкі.

**Літаратура:**


1. Музыка в начальных классах. — М., 1985.
2. Музыка и движение (упражнения, игры и пляски для детей 6 — 7 лет). — М., 1984.
3. Подгорных Е. М. Освоение детьми художественного образа в условиях комплексного воздействия искусства (Активизация творческой деятельности детей младшего школьного возраста: Сб. научн. тр.). — Свердл. пед. ин-т, Свердловск, 1984.
4. Удальцова Я. І., Старжынская Н. С. Дыдактычныя гульні ў дзіцячым садзе. — Мн., 1988.
5. Хадановіч Л. Формы арганізацыі музычна-гульнявой дзейнасці дашкольнікаў//Пралеска. — 1996. № 12.
6. Хрэстаматыя па беларускай дзіцячай літаратуры/(Склад. М. Ф. Шаўлоўская. — Мн., 1989.


**Заўвага.** Поўны варыянт зместу оперы з нотным запісам апублікаваны ў зборніку "Эстетическое воспитание детей и учащейся молодежи" (Мн.: Университетское, 1999).


**В. Г. КУХАРОНАК,**
**аспірантка НІА.**

г. Мінск.



МП "Авангард" предлагает учебные пособия:

- Детский шумовой оркестр (набор народных инструментов из 26 предметов).
- Палочки "Кюизенера" — набор из 119 деревянных разноцветных палочек.
- "Росчерки" (узоры графических упражнений) — пособие для начального обучения элементам письма.
- "Прописи" (русский, белорусский, английский шрифты) — пособие для обучения элементам письма.
- "Математический набор" — набор из 117 геометрических фигур, изготовлениых в соответствии с приложением к учебнику "Математика" (I — IV кл.).

За справками обращаться по адресу: **246027, г. Гомель, Речицкое шоссе, д. 26.**
**Тел. (0232) — 54-17-19.**